Гарадская цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма г.Гродна;
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу
ЦБ імя А.Макаёнка

# Шматгранны талент



## Да 100-годдзя А.К. Шыдлоўскага

2011

# Біяграфічная даведка

*“Як паветра, як хлеб, чалавеку патрэбна песня.*
*Без яе чалавек застаецца бяскрылым”.*

*А.К. Шыдлоўскі*



**Аляксандар Канстанцінавіч Шыдлоўскі – заслужаны дзеяч культуры Беларусі, самадзейны кампазітар, актыўны ўдзельнік заходнебеларускага культурнага і грамадска-палітычнага жыцця, аўтар вядомых песень, стваральнік песенных калектываў.**

**Нарадзіўся Аляксандр Канстанцінавіч 18 чэрвеня 1911 года ў вёсцы Мінкі, сёння Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Паходзіў з беднай сялянскай сям'і, якая складалася з сямі чалавек: бацька — Шыдлоўскі Канстанцін Ігнатавіч, маці – Ганна Восіпаўна, браты— Пётр і Павел, сёстры — Вера і Надзея.**

**Сям'я жыла бедна. Свайго хлеба хапала толькі да каляд, а там пераходзілі на бульбу. Таму, каб выжыць, прыходзілася старэйшым сястры Веры і брату Пятру хадзіць на заработкі ў Смаргонь.**

**Да першай сусветнай вайны Смаргонь была буйным прамысловым і гандлёвым цэнтрам: тут кожны тыдзень у сераду збіраліся вялікія кірмашы. Гандлявалі пераважна свойскай жывёлай. У горадзе жылі рабочыя, якія працавалі на фабрыках, дзе выраблялі скуры. Былі развіты і хатнія рамёствы: выпякалі абаранкі, пернікі і іншыя вырабы з мукі.**

**Смаргоншчына — цудоўны куточак Беларусі. Тут шмат лясоў і бароў, працякае прыгажуня рака Вілія. Захавалася і цудоўнае народнае мастацтва: песні, танцы, абрады, музыка. Народныя майстры самі рабілі цымбалы, скрыпкі, бубны. Людзі гэтай зямлі ўмелі і працаваць, і весяліцца.**

**Але вось прыйшла вялікая бяда — пачалася сусветная вайна. Калі немцы ўвайшлі ў вёску, то ўжо вечарам таго ж дня ў канцы сяла**

**на гарызонце віднелася вогненнае зарыва. Пачаліся перапалох і паніка. Людзі уцякалі на ўсход, далей ад фронту, які хутка набліжаўся. Сям'я Шыдлоўскіх, пакінуўшы дом і гаспадарку, выехала возам на гасцінец і рушыла ў напрамку Маладзечна, Мінска, Магілёва. Тады трохгадовы Аляксандр здзейсніў сваё першае ў жыцці вялікае падарожжа. Ехаць было цяжка. Дарогу забілі бежанцы, салдаты, што ішлі на фронт, павозкі з раненымі франтавікамі. Так, з вялікімі пакутамі, яны дабраліся да Магілёва. У Магілёве ўсіх бежанцаў, у тым ліку і іх сям'ю, пагрузілі ў таварныя вагоны і накіравалі доўгі эшалон у глыб Расіі. Шыдлоўскіх прывезлі ажно на Волгу, у г. Сімбірск, дзе яны і заставаліся да 1923 года.**

**Спачатку Шыдлоўскіх і яшчэ некалькі сем'яў размясцілі ў вёсцы Максімаўка. Там яны пражылі да вясны, а затым пераехалі ў г. Сімбірск, які вайна абышла стараной. Людзі спакойна працавалі, моладзь вучылася ў школах, гімназіях. У горадзе было шмат багатых людзей, асабліва купцоў, якія жылі ў прыгожых драўляных асабняках. Сям'ю Шыдлоўскіх пасялілі ў бараку, дзе жылі бежанцы. Бацьку ўдалося ўладкавацца на працу ў кадэцкі корпус прыбіральшчыкам. Яшчэ малым Аляксандр часта хадзіў да бацькі на працу, прыносіў яму ежу і бачыў, як некалькі мужчын і яго бацька надзявалі на ногі шчоткі і чысцілі паркетныя падлогі. Маці і старэйшая сястра крыху падраблялі прыбіраннем і мыццём бялізны. Так сям'я пражыла, больш-менш не галадалі, да 1917 года.**

**У гэтым жа годзе пачалася рэвалюцыя. Горад паступова пусцеў. А самае страшнае – пачалася грамадзянская вайна. Заработкаў не было, жыць стала вельмі цяжка і сям'я рашыла пераехаць жыць у падвальнае памяшканне па вуліцы Тэатральнай. У наступным годзе ў Сімбірску ўсталявалася савецкая ўлада. Бацька маленькага Аляксандра пайшоў служыць у міліцыю, а сярэдні брат Павел — добраахвотнікам у Чырвоную Армію, дзе яго адправілі ваяваць з Калчаком за Волгу. Старэйшы брат Пётр быў мабілізаваны ў войска, дзе трапіў у палон. Аляксандр з малодшай сястрой Надзеяй паступілі ў школу-інтэрнат імя Карла Маркса, дзе яны цэлы дзень працавалі, вучыліся і сталаваліся, а пасля прыходзілі дамоў на ноч. У пачатку 1920-х гадоў жыццё стала вельмі цяжкім: была вялікая засуха, пачаўся голад. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны сярэдні брат Павел вярнуўся дадому.**

**Завяршылася вайна Савецкай Расіі з Польшчай, і паводле Рыжскага мірнага дагавора ў 1921 годзе Заходняя Беларусь апынулася ў складзе Польшчы. Бежанцы пачалі вяртацца на сваю радзіму. У Сімбірску быў сфарміраваны вялікі эшалон з бежанцамі, сярод якіх апынулася і сям'я Шыдлоўскіх. Яны былі накіраваны на Захад, на радзіму. Дарога была доўгая і вельмі цяжкая: голад, бруд, хваробы. І ўсё ж у 1923 годзе усе яны жывымі прыехалі на сваю радзіму – Смаргоншчыну.**

**Пасля вайны ад Смаргоні засталіся адны руіны ды папялішча. Вёска, дзе раней жылі Шыдлоўскія, была спалена. На яе месцы немцамі былі пабудаваны шмат цэментных бліндажоў, у якіх раней хаваліся фашысцкія ваякі. Вось і сям'я Шыдлоўскіх пасялілася ў адным з такіх бліндажоў, пакуль не пабудавалі хату. Трэба было ўсё пачынаць з нуля.**

**Пад Смаргонню доўга трымаўся фронт, таму горад і навакольныя вёскі былі зруйнаваны. Уцалелі толькі далёкія вёскі, за дзесяткі кіламетраў ад Смаргоні. Туды маці і сёстры хадзілі капаць бульбу, каб зарабіць на пражыццё. Набліжалася халодная і галодная зіма. Вярнуўся з палону старэйшы брат Пётр. Каб выжыць, працавала ўся сям'я. Расчысцілі палі, пабудавалі сваю хату. Аляксандр з сястрой Надзеяй пайшлі у 7-класную польскую школу ў Смаргоні, бо беларускіх школ не было. Для дзяцей гэта школа была чужая, але трэба было вучыцца. Бацька быў пісьменны, таму хацеў, каб і дзеці былі такія ж. Сям'я жыла бедна, хаця ўсе дарослыя шмат працавалі. Зямлі, да таго ж неўрадлівай, пясчанай, было мала. Іншых заробкаў, як калісьці да вайны, у Смаргоні не было. Лепшая зямля належала польскім абшарнікам і магнатам. Каб умацаваць сваю ўладу на землях Заходняй Беларусі, польскі ўрад сяліў тут асаднікаў, даваў ім бясплатна лепшыя кавалкі зямлі.**

**Нацыянальны прыгнёт, беспрацоўе, зямельны голад — усё гэта выклікала вялікае незадавальненне працоўных гарадоў і вёсак Заходняй Беларусі. Пачаў нарастаць рэвалюцыйны рух. У першы польскі парламент (сейм) беларусы выбралі 12 паслоў, якія адстойвалі і абаранялі інтарэсы беларускага насельніцтва.**

**У 1927 годзе пачала дзейнічаць Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ), якую ўзначаліў Браніслаў Тарашкевіч. Гэта арганізацыя карысталася вялікім уплывам сярод сялянства. У сваёй праграме Грамада дамагалася беларускіх школ і зямельнай**

**рэформы, каб надзяліць сялянскую беднату зямлёй. У Грамаду ўступалі цэлымі вёскамі, і ў 1927 годзе яна налічвала ўжо 100 тысяч членаў.**

**Аляксандр Канстанцінавіч даведаўся з беларускіх газет, што ў Вільні існуе беларуская гімназія і восенню 1927 года Аляксандр паехаў туды паступаць. Паспяхова здаўшы ўступныя экзамены, ён пачынае вучыцца.**

**Вось што згадвае Аляксандр пра гады вучобы ў Вільні:**

***«Віленская беларуская гімназія знаходзілася каля самой Вострай Брамы. Гэта быў вялікі двухпавярховы будынак, – Базыльянскія муры. На другім паверсе размяшчалася духоўная семінарыя, а ўнізе – беларуская гімназія. Паступіў я ў гімназію ў 1927 годзе.***

***Гэта быў сапраўдны беларускі асяродак. І настаўнікі, і вучні размаўлялі толькі па-беларуску. У гімназіі выкладалі такія выдатныя педагогі, як Ігнат Дварчанін, Рыгор Шырма.***

***У Віленскай беларускай гімназіі я правучыўся няпоўныя тры гады. Яна назаўжды засталася ў маёй памяці».***

**У гімназіі ён пазнаёміўся з Рыгорам Раманавічам Шырмай, які выкладаў спевы і кіраваў хорам. Аляксандр вельмі любіў беларускія песні і таму спяваў у песенным калектыве. У гімназіі праводзілася вялікая культурна-асветная праца, ладзіліся літаратурныя вечары, канцэрты, танцы. У 1927 годзе тут існавала падпольная камсамольская арганізацыя Заходняй Беларусі, членам якой Шыдлоўскі з'яўляўся. За падпольную дзейнасць ён быў выключаны з гімназіі. Аляксандр разумеў, што трэба вучыцца. І ў 1929 годзе паступіў у Клецкую беларускую гімназію. Але і з яе быў выключаны за ўдзел у студэнцкай забастоўцы.**

**Аляксандр Шыдлоўскі з юнацтва свята верыў, што чалавек нараджаецца дзеля таго, каб быць вольным і шчаслівым. Бачыў, як прыгнятаецца беларускі народ, як зняважаецца родная мова і культура. І змагаўся з несправядлівасцю, як мог, як разумеў. Стаў рэвалюцыянерам-падпольшчыкам, удзельнічаў у пасольскім рабоча-сялянскім клубе «Змаганне», працаваў інструктарам Віленскага акруговага камітэта камсамола Заходняй Беларусі.**

**У 1930 годзе за рэвалюцыйную дзейнасць Аляксандр быў арыштаваны і зняволены ў Лукішскую турму ў Вільні. У 1931 годзе**

**акруговы суд у Вільні прыгаварыў яго да пяці гадоў цяжкага зняволення і пазбаўлення грамадзянскіх правоў на дзесяць гадоў. Ён сядзеў у турмах у Вільні, Варшаве, Пётркаве-Трыбунальскім, Серадзе. Пасля амаль шасці гадоў цяжкіх выпрабаванняў, Аляксандр Канстанцінавіч выйшаў на волю. Каб выжыць, працаваў на сезонных работах — у Вільні, Лідзе, а затым у Варшаве на вугальным складзе.**

**У Варшаве ён спаткаў свайго сябра па Віленскай беларускай гімназіі Язэпа Урбановіча, які таксама выйшаў з турмы і працаваў на фабрыцы "Сідоль". У канцы 30-х гадоў ў Варшаве было шмат рабочай і студэнцкай моладзі, якая збіралася ў Беларускай культурна-асветнай арганізацыі на вуліцы Свентакшыскай, 5. Тут ладзіліся літаратурныя вечары, а таксама канцэрты. З Вільні прыязджаў Максім Танк, часта выступаў вядомы беларускі спявак Міхась Забэйда-Суміцкі. Шыдлоўскі пачынае працаваць у прыватных будаўнічых фірмах простым рабочым да пачатку вайны Германіі з Польшчай. У верасні 1939 года, калі Заходняя Беларусь была вызвалена Чырвонай Арміяй, ён вярнуўся з Варшавы ў сваю родную вёску да бацькоў.**

**У 1940 годзе ўрад БССР даручыў Рыгору Раманавічу Шырме арганізаваць Беларускі дзяржаўны ансамбль песні і танца. Шырма ездзіў па вёсках Заходняй Беларусі і набіраў таленавітую моладзь у ансамбль. Аляксандра Канстанцінавіча ён таксама запрасіў. Базай ансамбля быў г. Беласток, дзе знаходзілася абласная філармонія. У маі 1941 года ансамбль ужо быў поўнасцю падрыхтаваны да гастрольнай дзейнасці. З канцэртамі яго накіравалі ў Маскву, а пасля – ў Іванава-Вазнясенск.**

**Вайна застала ансамбль 22 чэрвеня у г. Арол, потым калектыў быў эвакуіраваны ў г. Краснаярск. Там выступаў з канцэртамі на прызыўных пунктах і для працоўных у гарадах Сібіры. Калі стала набліжацца зіма, ансамбль размясцілі ў два абсталяваныя вагоны, і яны ўсю вайну ездзілі па тэрыторыі СССР і выступалі для працоўных тылу, раненых у эвакашпіталях і байцоў 1-га і 2-га Беларускіх франтоў.**

**Калі ў 1944 годзе Беларусь была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, ансамбль перавялі ў Гомель, а 3 ліпеня 1944 года – ў Мінск. Калектыў прымаў удзел у парадзе беларускіх**

партызан і выступаў перад імі. У канцы 1944 года ансамбль перавялі ў г. Гродна, дзе ён знаходзіўся да 1953 года, а потым - у Мінск.

У ансамблі Аляксандр спаткаў сваё каханне, сваю зорачку на ўсё жыццё – спявачку Барбару Яфімаўну. Пазней яны і ажаніліся. У 1946 годзе, пасля перамогі, нарадзіўся сын – у гонар дзеда названы Канстанцінам. А потым з'явіліся на свет дачушкі Вера і Любоў. На жаль, Барбара Яфімаўна рана адышла з жыцця, але Аляксандр Канстанцінавіч хаваў яе светлы вобраз да самай старасці.

Ужо ў сталым узросце, сямейны чалавек і бацька, ён усё ж такі вырашыў здзейсніць сваю юнацкую мару – атрымаць адукацыю. Паступае завочна і паспяхова заканчвае ў 1950 годзе Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.В. Ламаносава. У яго дыпломе запісана: «Навуковы работнік у галіне гістарычных навук, выкладчык ВНУ, настаўнік СШ». З Гродна сям'я Шыдлоўскіх ужо не паехала ў Мінск у складзе ансамбля, і Аляксандр Канстанцінавіч пайшоў працаваць у чыгуначную СШ № 45 выкладчыкам гісторыі. Працуючы ў школе, ён арганізаваў там дзіцячы, а потым настаўніцкі харавыя калектывы, потым пачаў ствараць іх і ў горадзе. Харавы калектыў арцелі «Чырвоная Зорка» ўдзельнічаў у святах песні горада і за свае поспехі быў узнагароджаны ганаровымі граматамі і дыпломамі.

Працуючы з харавымі калектывамі, ён сам пачаў складаць песні. Першы зборнік з 35 песнямі выйшаў у 1963 годзе. Многія яго песні выконваліся не толькі самадзейнымі, але і прафесійнымі калектывамі. У 1960 годзе А.К. Шыдлоўскі атрымлівае ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры БССР». За поспехі ў самадзейным мастацтве ён быў пераведзены на пасаду дырэктара абласнога Дома народнай творчасці. У гэты час самадзейнае мастацтва на Гродзеншчыне дасягнула небывалага росквіту ва ўсіх жанрах. Яно вылучалася сваёй арыгінальнасцю і самабытнасцю.



Асабліва развівалася такая форма мастацкай самадзейнасці, як ансамбль песні і танца. Кожны ансамбль павінен быў быць па-свойму самабытным. Так узніклі наступныя ансамблі песні і танца: «Нёман»

**(Гродна), «Свіцязь» (Навагрудак), «Крыніцы» (Ашмяны), «Рэчанька» (Дзятлава), «Ніва» (в. Верцялішкі), «Маладосць» (Ваўкавыск) і інш. Шматлікія калектывы атрымалі ганаровае званне «народны». Мастацкая самадзейнасць Гродзенскай вобласці паспяхова выступала на рэспубліканскіх Дэкадах самадзейнага мастацтва і на юбілейных святах СССР і БССР.**

**Аляксандр Канстанцінавіч працягваў займацца творчай працай. У 1990 годзе выйшаў другі зборнік песень «Ляці, наша песня», у якім было змешчана 29 твораў.**

**Нават, калі прыйшла пара ў 1971 годзе выйсці на пенсію, працы ён не пакідаў і працягваў яе да 1995 года у доме народнай творчасці. Плённа займаўся кампазітарскай дзейнасцю і рыхтаваў песні для свайго трэцяга зборніка.**

**За поспехі ў развіцці мастацкай самадзейнасці і за творчую кампазітарскую дзейнасць Аляксандр Канстанцінавіч быў узнагароджаны шматлікімі Ганаровымі граматамі і дыпломамі Міністэрства культуры СССР і БССР, Гродзенскага аблвыканкама і гарвыканкама, прафсаюза работнікаў культуры іншых арганізацый.**

**Памёр Аляксандр Канстанцінавіч 26 верасня 2002 года.**

**23 верасня 1987 г. А.К. Шыдлоўскаму было прысвоена званне Ганаровага грамадзяніна г. Гродна.**

**У гонар вядомага дзеяча культуры у горадзе Гродна з’явілася вуліца імя А.К. Шыдлоўскага ў мікрараёне «Зарыца-1».**




**У 2011 годзе на будынку абласнога метадычнага цэнтра, дзе 35 гадоў працаваў заслужаны деяч культуры, была адчынена мемарыяльная дошка.**

**Цудоўны знаўца жыцця і побыту, гісторыі і культуры свайго народа, улюблённы ў беларускае мастацтва, натхнёны прыгажосцю роднага краю, А.К. Шыдлоўскі стаў яго палымяным песняром. Мастацтвазнаўца Ісідор Нісневіч пісаў: «Песні мілагучныя, шчырыя, налітыя водарам роднай зямлі, яе паэтычнай мовы... Таму, мусіць, нашы фалькларысты запісалі ў розных беларускіх вёсках песні і вершы Шыдлоўскага як узоры сучаснай народнай творчасці. Што ж, нізкі паклон мастаку, чые мелодыі і паэтычныя радкі народ лічыць сваімі!».**

# ТЫ ЗОРКА МАЯ ЗАЛАТАЯ

З пачуццем

Сл. А.Цыхуна




1.Расплыўся туман над ракою,
За вёскамі дрэмлюць сады.
Я йду на спатканне з табою,
А месяц між зор малады.

2.Ён у свеце адзін толькі знае
Пра нашы сустрэчы з табой,
Ты зорка мая залатая -
Каханне вясны маладой.

3.Цябе я сустрэў каля рэчкі
Ля нашай вярбы векавой,
Мне ціха шапталі лісточкі,
Што вечна ты будзеш са мной.

4.Салоўкі спяваць будуць у гаю,
Сады ў звоне пчолак цвісці…
Сцяжынкамі роднага краю
Мы будзем з табою ісці.

# СПЯВАЙМА, СЯБРЫ ДАРАГІЯ

Сл. А.Шыдлоўскага




1. Спявайма, сябры дарагія,
   Каб радасць у хаты прыйшла;
   Спявайма, каб мары збыліся
   І доля шчадрэйшай была.

2. Час хутка наперад імкнецца,
   І ўсё прамінае, як сон,
   А песня кранае нам сэрца
   І будзіць народ нібы звон.

3. Нас песня на подзвіг натхняе
   І шчыра раскажа пра ўсё.
   І там, дзе яна не змаўкае –
   Ў людзей, нібы песня, жыццё.

4. Мы песняй дзень новы вітаем,
   Вітаем блакітны прастор.
   Хай песні лунаюць над краем,
   Ляцяць аж да сонца і зор.

# Спіс літаратуры

## *Творы А.К. Шыдлоўскага:*


1. Колькі ў небе зор…: Смаргоншчына літаратурная: паэзія, проза, публіцыстыка / уклад. М. Казлоўскі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2009. – 399 с. – (Беларусь літаратурная).
2. Шыдлоўскі, А. Навагодняе пажаданне: [Песні] / А. Шыдлоўскі // Гродзенская праўда. – 2001. – 13 студз. – С. 12.
3. Шыдлоўскі, А.К. О, Беларусь: зборнік песень / А.К. Шыдлоўскі. – Гродна, 2001. – 24 с.
4. Шыдлоўскі, А.К. “Ой, ты, Нёман родны” / А.К. Шыдлоўскі // Откуда, песня, ты берёшь начало: сб. песен в обраб. А. Шамли / сост. вступ. ст. М.А. Копп. – Гродно: Гродненский ОМЦНТ, 2005. – С. 5.
5. Шыдлоўскі, А.К. “Песні ад шчырага сэрца”: уступны артыкул / А.К. Шыдлоўскі // Над сінім Нёманом: зб. песен / М. Копп; Беларускі ін-т прабл. культуры. – Мінск, 1993. – С. 2.
6. Шыдлоўскі, А.К. Успаміны аб пеpажытым [камп., педагога, дзеяча самадзейн. маст-ва (з 1951 па 1971 працуе ў Гродна) А.К. Шыдлоўскага] // Памяць Гродна: гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 636-639.


## *Публікацыі аб А.К. Шыдлоўскім:*


7. Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Беларуская ССР: у 5 т. – Мінск, 1982. – Т. 5. – С. 677.
8. Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Беларускі фальклор: у 2 т. – Мінск: БелЭн, 2006. – Т. 2. – С. 772.

9. Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 2004. – Т. 18. – С. 8.

10. Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Гродна: энцыклапедычны слоўнік / БелСЭ. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 414-415.

11. Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск: БелСЭ, 1987. – Т.5. – С. 603-604.

12. Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Памяць: Смаргонскі раён. – Мінск: БелЭН, 2004. – С. 555-556.

13. Антонова, А. Святая к музыке любовь: [к 100-летию А.К. Шидловского] // Гродзенская праўда / Анна Антонова. – 2011. – 25 чэрвеня. – С. 8.

14. Заслужаныя дзеячы і работнікі культуры Рэспублікі Беларусь. Гродзеншчыны: зборнік нарысаў / Упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкома; Абласны метадычны цэнтр народнай творчасці. – Гродна, 1999. – 31 с.

15. Ключнік, Г. Чалавеку патрэбна песня: тв. сустрэча з паэтам і камп. А.К. Шыдлоўскім // Гродзенская праўда. – 1996. – 23 мая. – С. 3.

16. Лабовіч, А. Няхай зайздросцяць маладыя: [аб гродз. камп. А.К. Шыдлоўскім]: фота // Биржа информации. – 2001. – 2 сент. – С. 6.

17. Навіцкая, Л. Гродзенскі вальс Аляксандра Шыдоўскага [да 90-годдзя кампазітара] // Гродзенская праўда. – 2001. – 16 чэрв. – С. 5.

18. Навіцкая Л. Знайсці сваю песню: пра жыццёвы і творчы шлях А.К. Шыдлоўскага // Гродзенская праўда. – 1991. – 10 крас.

**19. Петрашэвіч, Я. Пясняр Прынямоння [кампазітар А. Шыдлоўскі] / Я. Петрашэвіч // Пагоня. – 1996. – №24. – С. 8.**

**20. Пяткевіч, А.М. З матчыным словам і песняю [аб А.К. Шыдлоўскім] / А.М. Пяткевіч // Старонкі спадчыны: культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з'явы, асобы. – Мінск, 2006. – С. 181-183.**

**21. Пяткевіч, А.М. З матчыным словам і песняю: А. Шыдлоўскаму – 85 гадоў // Гродзенская праўда. – 1996. – 18 чэрв.**

**22. Пераход, А. Песні яго душы: [аб А.К. Шыдлоўскім] // Звязда. – 2001. – 25 жн. – С. 10.**

**23. Пяткевіч, А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: даведнік / А.М. Пяткевіч; Гродзенскі дзярж. ун-т імя Я.Купалы. – Гродна, 2000. – С. 336-337.**

**24. Пятроўскі, Р. Зоры Аляксандра Шыдлоўскага [Электрон. рэсурс]. – Рэжым доступу: http://gazeta.grodno.by/176/t94.html. – 19.01. 2011.**

**25. Островцов, С. Яркая судьба [о А.К. Шидловском] // Гродненская правда. – 1988. – 1 мая. – С. 4.**

**26. Цыхун, А. “Без роднай мовы, без роднай песні, нібы без сонца наша жыццё...”: да 89-годдзя А.К. Шыдлоўскага: фота // Гродзенская праўда. – 2000. – 24 чэрв. – С. 6.**

**27. Чегодаева, С. Годы не властны над песней / С. Чегодаева // Новая газета Сморгони. – 2001. – 19 июня. – С. 7.**

**28. Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч [Электрон. рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.harodnia.com/sl057.php. – 19.01.2011.**

**29. Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Гродна і гродзенцы / склад. Я.М. Жабрун. – Гродна: ГрДУ, 1999. – С. 22.**

**30. Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч // Гродна: імёны выдатных асоб / склад. Я.М. Жабрун.– Гродна, 1996. – С. 12.**

# Змест

**Біяграфічная даведка .................................................................1**
**Дадатак.........................................................................................8**
**Спіс літаратуры.........................................................................10**
*Творы А.К. Шыдлоўскага.............................................................10*
*Публікацыі аб А.К. Шыдлоўскім ...................................................10*

*Складальнік: Сігай В.Э.*
*Рэдактар: Пянтэгава А.Ул.*
*Адказны за выпуск: Камарова М.А.*